Основной задачей усилий всех стран постсоветского пространства – отнестись чрезвычайно ответственно и взвешенно ко всем реформам, проводимым или планируемым в области образования и формирования единого образовательного пространства стран СНГ. Есть вполне реальная угроза растерять достоинства и достижения отечественного высшего образования, не приобретя пока еще преимуществ западноевропейского образования, А это уже грозит потерять целое поколение, от которого зависит будущее Союзного государства.

**Литература**

*1. Глобализация, регионализация, пограничье. Монография под науч. редакцией М.А. Слемнева. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2018. – 216 с.*

*2. Заседание Совета по сотрудничеству в области образования государств-участников СНГ. Москва, 12.04.2017. (Электронный ресурс): http//obrnadzor.gov.ru./ru/press_centr/news//.*

*3. В Москве прошел первый Межуниверситетский форум Союзного государства России и Беларуси. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: teleskop. by.org. – Дата доступа: 20.10.2018.*

## ВЫХАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ СТУДЭНТАЎ ПРАЗ РОДНУЮ МОВУ

**Скачкова В.А.,**
Гомельскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта "МІТСО",
г. Гомель, Рэспубліка Беларусь

У беларускім грамадстве існуе глыбокае перакананне ў тым, што толькі моцная дзяржава можа быць абаронцай ад знешніх пагроз, палітычных і сацыяльных узрушэнняў.

Сёння Беларусь мае патрэбу ў чалавеку-грамадзяніну, які здольны працаваць не толькі дзеля ўласнага дабрабыту, але і на карысць грамадства, патрэбу ў грамадзянінупатрыёту, які адчувае пачуццё гонару за сваю Радзіму. Сучасны этап фарміравання грамадскай свядомасці прад'яўляе ўсё больш высокія патрабаванні да выхавання насельніцтва краіны ў духу грамадзянскасці і патрыятызму. Задача складаецца ў тым, каб захаваць векавыя традыцыі і маральныя каштоўнасці – любоў да Айчыны, павагу да працы, нацыянальную і рэлігійную цярпімасць, справядлівасць, гатоўнасць да абароны роднай зямлі. Неабходна захоўваць пераемнасць пакаленняў, фарміраваць паважлівае стаўленне маладых людзей да вынікаў ранейшых здзяйсненняў, не дапусціць разрыву маральна-этычных сувязяў паміж пакаленнямі.

Патрыятычнае выхаванне прадугледжвае прывіццё любові не толькі да краіны, але і да сваёй малой радзімы – роднага дома, школы, вёскі, традыцый, звычаяў, беларускай прыроды.

Выхаванне патрыятызму праз роднае слова у Беларусі яшчэ толькі пачынаецца. Адраджэнне беларускай культуры – складаны і шматгранны працэс, у аснове якога ляжыць павага да роднай мовы як галоўнай духоўнай каштоўнасці народа з усімі яго нацыянальнымі асаблівасцямі.

Кожны год студэнты першага курса Гомельскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» пішуць сачыненне на беларускай мове «Мая Радзіма – Беларусь». Мэта напісання сачынення – развіццё пачуцця мовы, лінгвістычнага мыслення, умення бачыць і адчуваць Слова; выпрацоўка навыкаў выкладання сваіх думак у пісьмовай форме.

Ад студэнтаў не патрабуецца прытрымлівацца якой-небудзь пэўнай схемы, прапануецца выкладаць уласныя думкі, погляды, зыходзячы з прапанаванай тэмы. Хтосьці



Репозиторий ВГУ

ідзе найпрасцейшым шляхам, выкарыстоўваючы Інтэрнэт-рэсурсы і прадстаўляючы ўжо гатовы, кімсьці напісаны, тэкст. Звычайна такія працы выкладчыкам тут жа выяўляюцца па прычыне пазнавальнасці, паўтаральнасці адных і тых жа матэрыялаў. Але большая частка студэнтаў ставіцца да гэтай працы добрасумленна.

Кожнае сачыненне – гэта асаблівае бачанне маладым пакаленнем навакольнага свету, працэсаў, якія адбываліся і адбываюцца на нашай зямлі.

Большасць прац пачынаецца з раскрыцця значэнняў такіх, на першы погляд, усім зразумелых паняццяў, як “Беларусь”, “Радзіма”, “Бацькаўшчына”: “Бацькаўчына – гэта самы вялікі скарб, які людзі павінны берагчы і захаваць для прашчураў”; “Беларусь – цікавы край, мужны”; “Радзіма – гэта дом, дзе ты нарадзіўся і вырас. Радзіма – гэта і калыханка, якую спявала табе маці, і казка, якую расказвала бабка, і тая першая кніга, з якою ты пайшоў у школу”; “Беларусь... Гэта і родныя, знаёмыя з дзяцінства краявіды, і прыгожыя, працавітыя, сціплыя людзі”.

Многія радкі сачыненняў прысвечаны апісанню краявідаў роднай зямлі: “Беларусь – гэта край блакітных азёр, край лясоў, край прыгожых мясцін з птушынымі спевамі”; “Там залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, якія напоўнены птушыным звонам, і пушчы, падобныя на храмы, пушчы, дзе шмат розных жывёл: алені, рысі, лісы, зубры і шмат іншых”.

Не забываюць студэнты славутых сыноў і дачок сваёй радзімы: Е. Полацкую, Ф. Скарыну, Я. Купалу, Я. Коласа і многіх іншых. Адзначаюць той велізарны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры, які ўнеслі яны сваёй творчай дзейнасцю: “... Я стаяў і думаў аб тым, што не здарма наша Беларусь нарадзіла і Янку Купалу, і Якуба Коласа. Толькі прыгажосць нашай сінявокай Беларусі пабуджала нашых пісьменнікаў пісаць свае творы”; “Найвялікшы скарб Беларусі – гэта людзі. Яны ўслаўляюць сваю зямлю, нясуць у свет добрае імя беларусаў”.

Студэнты ганарацца не толькі сваёй Радзімай-краінай, грамадзянамі якой з'яўляюцца, але і сваёй малой радзімай – мясцовасцю, з якой яны прыехалі вучыцца ў Гомель, сваім горадам або вёскай, дзе прайшло дзяцінства, дзе былі зробленыя першыя няўпэўненыя крокі: “Я вельмі люблю сваю родную старонку, і лепш за яе мне нічога не трэба. І ведаю я, што такога замілаванага месца, як мой маленькі куточак, мой Рагачоўскі край, больш нідзе няма!”.

Успамінаюць студэнты праслаўленае гістарычнае мінулае сваёй Радзімы, часы існавання Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага. Прыкладам з'яўляецца сачыненне Івановай Таццяны. Студэнтка праводзіць своеасаблівы гістарычны экскурс з часоў Полацкага княства, дзейнасці Ефрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага і да сучаснага перыяду існавання Беларусі. Таццяна заканчвае выклад наступнымі словамі: “Хто забывае сваю гісторыю, той бяднее, ператварае сваё жыццё ў існаванне без каранёў, без вытокаў, а значыць і без будучыні, таму што Бацькаўшчына – гэта наша мінуўшчына, сучаснасць і будучыня”.

Пачуццём гонару за родны край, свой працавіты народ, прасякнуты радкі многіх твораў: “Нам, беларусам, ёсць чым ганарыцца”; “А яшчэ мне вельмі хочацца, каб мае дзеці ганарыліся маёй працай так, як я ганаруся тым, што мая бабуля усё сваё жыццё працавала на Мінскім гадзіннікавым заводзе”; “Яшчэ я ганаруся сваім народам, які выстаяў вайну, не пакарыўся ворагу”; “Я вельмі ганаруся, што нарадзілася, жыву, вучуся ў гэтай цудоўнай краіне, якая завецца – Беларусь”; “У беларускай моладзі добрыя перспектывы. Любы малады чалавек можа развіць свае таленты. Мы можам выбраць любую прафесію. Важна ўбачыць у сабе талент  і імкнуцца ажыццяўлення сваёй мары”.

Многія творы прысвечаны такой далёкай для цяперашняга пакалення маладых людзей вайне, у якой прымалі ўдзел іх дзяды і прадзеды: “Калі я бачу ветэранаў, у мяне, якая не ведала вайны, наварочваюцца слёзы на вачах”.

Як самыя дарагія рэліквіі, у сем'ях захоўваюць дакументы, узнагароды ўдзельнікаў вайны, распавядаюць дзецям пра іх гераічныя подзвігі. Студэнты ў творах прыводзяць



Репозиторий ВГУ

вытрымкі з некаторых дакументаў: “Таварыш Котчанка, будучы старэйшым дыверсійнай групы, пусціў пад адхон 10 варожых эшалонаў, 1 бронецехнік. У выніку пабіта 11 паравозаў, 105 вагонаў, з іх 36 вагонаў з жывой сілай, 69 – з тэхнікай, боепрыпасамі, рыштункам, харчаваннем… Знішчана 2 баявыя пляцоўкі бронецягніка з 4-ма прыладамі”.

Радкі твораў напоўнены верай ва ўсё добрае, светлае. Цяперашняе маладое пакаленне, якое бачыла вайну толькі па фільмах, кнігах, не жадае пакутаваць ад нашэсця чужынцаў, не жадае адпраўляцца ў чужы край ў якасці бясплатнай працоўнай сілы: “Мне хацелася б, каб у жыцці кожнага з нас ніколі не надыходзіла тая сумная часіна, якая адарвала б нас ад роднай зямлі, каб радасць адзінства з Радзімай заўсёды жыла ў нашых душах”.

Студэнты разумеюць важнасць захавання культурных здабыткаў, народных традыцый, мовы, прыродных рэсурсаў роднага краю, якія дасталіся нам у спадчыну ад нашых продкаў. І ў гэтым яны бачаць сваё прызначэнне на зямлі, сэнс жыцця: “І мы павінны захаваць скарб, дадзены нам Богам на шчасную долю, зберагчы для нашчадкаў і зуброў з бусламі, і старыя вежы, і цішыню пушчы, і міласэрнасць, і чалавечнасць. І ў гэтым заключаецца хаця б невялікі, але подзвіг кожнага з нас”; “Хочацца заверыць, што мы не падвядзём нашых продкаў і бацькоў, будзем берагчы  і памнажаць тое, што яны перадалі нам ў спадчыну”.

“Нідзе так звонка не чуваць спеў жаваранка, як у Беларусі, нідзе няма такой прыроды, такіх лясоў, палёў, азёраў, рэкаў, жывёл, птушак, зямлі! Як у нас – Беларусі. Народ нічым не горшы за другія народы – нічым! Ён – добры і шчыры, вялікі і таленавіты, але ён стане яшчэ больш вялікім і магутным, калі лепей пазнае сябе і мацней паверыць у сябе. Сам народ стаіць на парозе прыгожай і вялікай будучыні!”

Вядома ж, чалавек павінен быць высокакваліфікаваным спецыялістам, майстрам сваёй справы. Але яшчэ пры ўсіх сваіх прафесійных ведах ён павінен быць сапраўднай асобай – чалавекам высокай унутранай і знешняй культуры, носьбітам глыбокай маральнасці.

## МЕТОДИКА ВОСПИТАНИЯ МОЛОДЁЖИ В УСЛОВИЯХ ПОЛИКУЛЬТУРНОЙ СРЕДЫ

**Соловьев В.Г.,**
СевГУ, г. Севастополь, Российская Федерация
**Кириченко В.В., Соловьева И.Б.,**
АГГПУ им. В.М. Шукшина, г. Бийск, Российская Федерация

Мы живём в сложное, противоречивое время. Меняются люди, происходит переоценка нравственных ценностей.

В советский период патриотическое воспитание было обязательным для каждой школы. Однако, в период с 1930-1980 гг. шел процесс создания единой, безнациональной общности – советского народа. В период перестройки неверно понятая деидеологизация и деполитизация школы привела к девальвации патриотизма и исчезновению его из школы. Это ещё больше обострило проблему воспитания подрастающего поколения. Нарушились традиции, прервались нити, связывающие старшие и младшие поколения. Произошла ценностная дезориентация подрастающих поколений. И сегодня попрежнему остаётся актуальной задача проведения национальной политики, которая учитывала бы требования всех народообразующих факторов.

Российская федерация велика в своём многообразии населяющих её народов. Человек должен во всём соблюдать достоинство своего народа, гордиться его призванием, величием, успехами.



Репозиторий ВГУ